Дашкольная праграма

# Чытанка-маляванка

Казкі народаў свету

5+



Аверсэв

## Прадмова

Шаноўныя дарослыя!

Кніга, якую вы трымаеце ў руках, створана для дзяцей ад пяці гадоў. У ёй сабраны казкі народаў свету, што вучаць спрадвечнай народнай мудрасці: пра тое, як важна быць добрым і смелым, шанаваць бацькоў, умець сябраваць. Дзеці адчуюць сябе сапраўднымі чараўнікамі, калі будуць расфарбоўваць малюнкі і ствараць свой каляровы казачны свет.

«Чытанкі-маляванкі» змяшчаюць літаратурныя творы дашкольнай праграмы розных жанраў: вершы і забаўлянкі, аўтарскія і народныя казкі, легенды і паданні. Кожная кніга падрыхтавана з улікам узроставых асаблівасцей.

Заняткі з «Чытанкамі-маляванкамі» будуць спрыяць развіццю ўважлівасці і эмацыйнай рэакцыі на чытанне, дапамогуць выхаваць у дзяцей любоў да роднага слова, выклікаць інтарэс да літаратуры і самастойнай творчай дзейнасці.

Жадаем поспехаў!

# Крылаты, Калматы ды Маслены

*Руская народная казка*

У лясным дамку жылі тры браты: Верабей Крылаты, Пацучок Калматы ды Блін Маслены.

Верабей з поля прыляцеў, Пацучок ад ката ўратаваўся, Блін з патэльні збег.

Кожны з іх рабіў сваю справу. Верабей ежу прыносіў, Пацучок дровы сек, а Блін абед гатаваў.





Добра яны жылі. Часам вернецца Верабей, памыецца, сядзе адпачываць. А Пацучок дровы цягае, стол накрывае. А Блін поліўку ды кашу варыць.

Сядуць за стол – і хваляць абед.

– Вось дык поліўка – такая тлустая! – кажа Верабей.

А Блін яму:

– Гэта я, Блін Маслены, акунуся ў гаршчок – вось поліўка і тлустая!

А Верабей кашу есць і нахвальвае:

– Вось дык каша – такая гарачая!

А Пацучок яму:

– А я дроў навязу, дробна нагрызу, у печ нагружу, агонь добра гарыць – вось каша і гарачая!

– Ды і я не зломак, – кажа Верабей. – Збіраю грыбы ды бабы – вось вы і сытыя!

Так яны і сябравалі, адзін аднаго хвалілі і сябе ў крыўду не давалі.

Але аднойчы Верабей задумаўся:

«Я цэлы дзень па лесе лётаю, а яны што? Блін ранкам на печы ляжыць-раскашуе, а гатаваць толькі ўвечары пачынае. Пацучок зранку дровы вязе і грызе, а пасля на печ запаўзе – і спіць да абеду. Так далей нельга!»

Раззлаваўся Верабей, ножкамі затупатаў, крылцамі залапатаў, крычыць:

– Заўтра мяняемся працай!

Так і зрабілі. Наступным ранкам Блін пайшоў шукаць ежу, Верабей – дровы сячы, а Пацучок – абед гатаваць.

Коціцца Блін па лесе і спявае:

– Скок-паскок,
Скок-паскок,
А я – Маслены Блінок!
Мяне на смятане замяшалі,
Мяне на масле запякалі!

Тут насустрач яму Ліса Патрыкееўна:

– Добра ты спяваеш, – кажа яна. – Дык цябе, кажаш, на смятане замяшалі?

А Блін ёй:

– На смятане ды з цукрам!

А Ліса яму:



– Скок-паскок, кажаш?

Ды як скокне, як фыркне, як ухопіць Блін – ням!

А Блін крычыць:

– Як мне збегчы ад Лісы ў дрымучыя лясы, як мне збегчы ў грыбы – за бярозы, за дубы!

А Ліса яму:

– Не, я цябе з'ем!

Ледзь Блін вырваўся – пакінуў у Лісіных зубах бок і пабег дадому!

А там што робіцца!

Пацучок узяўся за поліўку. «Як Блін яе гатаваў? А, ён у гаршчок нырцаваў – і поліўка рабілася тлустай!»

Кінуўся ён у гаршчок. Абварыўся, апарыўся, ледзь выскачыў! Футра пааблазіла, хвосцік дрыжыць. Сеў на лаўку ды плача.

А Верабей дровы вазіў: навазіў, нацягаў ды пачаў дзяўбці. Дзёўб – і дзюбу набок пагнуў. Сеў ля прызбы ды плача.

Прыбег Блін дадому і бачыць: сядзіць Верабей на прызбе – дзюба набок, слёзы ручаём. Забег у дамок, а там Пацучок на лаўцы – футра пааблазіла, хвосцік дрыжыць.

Тут Блін і кажа:

– Так заўсёды бывае, калі нехта зайздросціць, сваю справу рабіць не хоча.

Верабей ад сораму залез пад лаўку.

Але што рабіць, паплакалі-пабедавалі і зажылі па-ранейшаму: Верабей ежу шукае, Пацучок дровы сячэ, а Блін поліўку і кашу гатуе.

Так яны і жывуць, пернікі жуюць, мёдам запіваюць, пра нас з вамі ўспамінаюць.



# ХТО БАІЦЦА, ТАМУ ЎВАЧЧУ ДВАІЦЦА

*Руская народная казка*

Жылі калісьці старая бабулька, унучка-рагатушка, Курка-квахтушка і Мышка-нарушка. Штодзень хадзілі па ваду. У бабулькі вёдры вялікія, ва ўнучкі – маленькія, у Куркі – з агурок, у Мышкі – з напарстак. Бабулька брала ваду з калодзежа, унучка – з калоды, Курка – з лужыны, а Мышка – са следу ад парасячага капытка.

Пайшлі яны аднойчы па ваду. А дадому вярталіся праз агарод. А ў ім яблынька расла, а на ёй яблычкі віселі. А пад яблынькай Зайка сядзеў. Наляцеў вецер, яблыньку хістануў, яблычак – лясь! – Зайку ў лоб! І скокнуў Зайка проста нашым ваданосам пад ногі.

Спужаліся яны, вёдры пакідалі і дадому пабеглі. Бабулька на лаўку звалілася, унучка за бабульку схавалася, Курка на печку ўзляцела, а Мышка пад печкай зашылася.

Бабулька вохкае:

– Мяне мядзведзь вялізны ледзь не задушыў!

Унучка плача:

– На мяне такі страшны воўк наскочыў!





Курка квохча:

– Ко-ко-ко! Ліса да мяне падкралася, ледзь не схапіла!

Мышка пішчыць:

– Які вусаты кот! Нацярпелася я страху!

А Зайка ў лес прыбег, пад кусцік залёг і думае:

– Вось дык жахі! Чатыры паляўнічыя з сабакамі за мной гналіся, не ведаю, як уратаваўся!

Правільна людзі кажуць: «Хто баіцца, таму ўваччу двоіцца».

# СІЎКА-БУРКА

*Руская народная казка*

Жыў стары, і былі ў яго тры сыны. Малодшага ўсе Іванкам-дурнем клікалі. Пасеяў неяк стары пшаніцу, ды толькі панадзіўся нехта яе мяць і таптаць.

Вось і кажа стары сынам:

– Трэба кожную ноч пшаніцу па чарзе сцерагчы і злодзея злавіць!

Надышла першая ноч. Пайшоў першы сын пшаніцу сцерагчы, ды не вытрымаў – залез у адрыну, на сена, як на пярыну, і праспаў там да ранку. Прыходзіць раніцай дадому і кажа:

– Усю ноч я не спаў, пшаніцу вартаваў, а злодзея не бачыў.

У другую ноч пайшоў другі сын і таксама праспаў да ранку ў адрыне – на сене, як на пярыне.

У трэцюю ноч прыйшла чарга Іванку-дурню ісці. Узяў ён вяроўку і пайшоў. Сядзіць на полі, не спіць, злодзея чакае.

Апоўначы прыскакаў на пшаніцу конь – адна шарсцінка срэбная, другая залатая, бяжыць – зямля дрыжыць, з вушэй дым слупам валіць, з ноздраў полымя пыхкае. І пачаў той конь пшаніцу есці і таптаць. Падкраўся Іванка-дурань да каня і накінуў яму на шыю вяроўку. Пасля на яго скочыў і ўчапіўся за грыву. Насіў яго конь па полі, насіў, скакаў з ім, скакаў – а скінуць не можа!





Пачаў конь Іванку прасіць:

– Адпусці мяне, Іванка, на волю! Я табе за гэта паслужу.

– Добра, – адказаў Іванка, – адпушчу. Але як я цябе пасля знайду?

– А ты выйдзі ў чыстае поле, на шырокае раздолле, крыкні голасам волата: «Сіўка-бурка, буланая шкурка, стань перада мной, як ліст перад травой!» – і я тут жа з'яўлюся.

Адпусціў Іванка каня, узяўшы з яго абяцанне ніколі больш пшаніцы не есці і не таптаць.

Прыйшоў Іванка раніцай дадому і расказвае:

– Злавіў я каня, адна шарсцінка – срэбная, другая – залатая.

– І дзе той конь? – пытаюць браты.

– Ён паабяцаў больш у пшаніцу не хадзіць, вось я яго і адпусціў.

Не паверылі Іванку браты, пасмяяліся з яго. Толькі з той ночы ніхто больш пшаніцы не чапаў.

Неўзабаве пасля гэтага цар разаслаў па ўсіх вёсках пасланцоў:

– Збірайцеся, баяры і дваране, купцы і простыя сяляне, да цара на двор. Сядзіць царская дачка Алена Прыгожая ў высокім цераме ля акна. Хто на кані да царэўны даскокне і з яе рукі залаты пярсцёнак зніме, за таго яна пойдзе замуж.

У прызначаны дзень паехалі браты да царскага двара, а Іванку з сабой не ўзялі. Папрасіў Іванка ў братавых жонак кошык, сказаў, што пойдзе ў лес грыбы збіраць, і пайшоў з дому. Выйшаў Іванка-дурань у чыстае поле, на шырокае раздолле, кінуў кошык пад куст, крыкнуў голасам волата:



– Сіўка-бурка, буланая шкурка, стань перада мной, як ліст перад травой!

Конь бяжыць, зямля дрыжыць, з вушэй дым слупам валіць, з ноздраў полымя пыхкае. Прыбег і стаіць перад Іванкам як скамянелы.

– Чаго хочаш, Іванка?

– Хачу паглядзець на царскую дачку Алену Прыгожую!

– Тады залазь мне ў правае вуха, а ў левае вылазь!

Залез Іванка каню ў правае вуха, а ў левае вылез – і зрабіўся такім зухам, што ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць! Сеў на Сіўку-бурку і паскакаў у горад.

Прыскакаў Іванка на плошчу – проста да царскага палаца. Бачыць – люду не злічыць, а ў высокім цераме сядзіць царэўна Алена Прыгожая. На руцэ яе пярсцёнак каштоўны бліскае, сама ж – прыгажэйшай не знойдзеш. Глядзяць усе на Алену Прыгожую, а скакаць ніхто не рашаецца: няма ахвочых шыю ламаць.

Штурхануў тады Іванка Сіўку-бурку. Фыркнуў конь, заіржаў, скочыў – толькі на тры бервяны да царэўны не даскочыў. Здзівіўся люд, а Іванка павярнуў Сіўку-бурку і паскакаў прэч.

Прымчаўся Іванка ў чыстае поле, злез з каня, улез яму ў правае вуха, а ў левае вылез і зноў зрабіўся Іванкам-дурнем. Адпусціў каня, набраў поўны кошык мухамораў і пайшоў дадому. Раззлаваліся братавы жонкі і кажуць:

– Ну і грыбы! Сам іх есці будзеш!

Вярнуліся браты і расказваюць:

– Які да цара зух прыязджаў! Толькі на тры бервяны да царэўны не даскочыў.

На другі дзень старэйшыя браты зноў у горад паехалі, а Іванка ўзяў кошык, выйшаў у чыстае поле, на шырокае раздолле, крыкнуў голасам волата:

– Сіўка-бурка, буланая шкурка, стань перада мной, як ліст перад травой!

Конь бяжыць, зямля дрыжыць, з вушэй дым слупам валіць, з ноздраў полымя пыхкае. Прыбег і стаіць перад Іванкам як скамянелы.

Улез Іванка Сіўку-бурку ў правае вуха, а ў левае вылез і зрабіўся сапраўдным зухам. Ускочыў на каня і паскакаў да царскага двара. Бачыць – на плошчы люду яшчэ больш. Усе царэўнай любуюцца, а скакаць ніхто і не збіраецца. Штурхануў тут Іванка свайго каня, заіржаў Сіўка-бурка, скочыў – толькі на два бервяны да акна царэўны не даскочыў.

Павярнуў Іванка каня і паскакаў прэч. Адпусціў Сіўку-бурку, а сам дадому пайшоў.

Прыязджаюць браты і расказваюць:

– Зноў той зух прыязджаў! Не даскочыў да царэўны толькі на два бервяны.

На трэці дзень браты зноў у горад паехалі. Іванка выйшаў у поле, на шырокае раздолле, крыкнуў голасам волата:

– Сіўка-бурка, буланая шкурка, стань перада мной, як ліст перад травой!

Конь бяжыць, зямля дрыжыць, з вушэй дым слупам валіць, з ноздраў полымя пыхкае. Прыбег і стаіць перад Іванкам як скамянелы.

Улез Іванка Сіўку-бурку ў правае вуха, а ў левае вылез. Зрабіўся сапраўдным зухам і паскакаў да царскага двара.



Прыскакаў Іванка да высокага церама, штурхануў Сіўку-бурку, заіржаў конь мацней, чым заўсёды, ударыў капытом – і даскочыў да акна! Пацалаваў Іванка Алену Прыгожую, зняў з яе пальца пярсцёнак і паскакаў прэч.

Адпусціў ён Сіўку-бурку, прыйшоў дадому. Адна рука анучай заматаная. Вярнуліся браты, пачалі расказваць, як і што было:

– Гэтым разам зух так скочыў, што да царэўны даскочыў і пярсцёнак з яе пальца зняў!

Праз тры дні цар зноў рассылае пасланцоў, каб увесь люд, колькі яго ёсць у царстве, сабраўся да яго на баляванне. Выправіліся браты да цара і павезлі з сабой Іванку-дурня. Прыехалі, селі за сталы дубовыя, за абрусы ўзорыстыя, п'юць-ядуць і размову вядуць. А Іванка залез за печку, у куток, і сядзіць там.

Ходзіць Алена Прыгожая і гасцей частуе. Кожнаму падносіць віна і мёду, а сама глядзіць, ці няма ў каго на руцэ яе пярсцёнка. Абышла яна ўсіх, падыходзіць да апошняга – да Іванкі. Падае Алена Прыгожая Іванку віна і пытае:

– А чаго гэта ў цябе рука анучай заматаная? Разматай анучу, пакажы мне руку!

Разматаў Іванка анучу, а на пальцы ў яго пярсцёнак царэўны так іззяе, так і палае!

Узрадавалася Алена Прыгожая. Памылі Іванку, прычасалі, прыгожа апранулі, і зрабіўся ён не Іванкам-дурнем, а сапраўдным зухам!

Доўга не чакалі і не разважалі, а радаснае вяселле згулялі! Я на тым вяселлі быў, мёд-піва піў, па вусах цякло, а ў роце не было.



# ЦАРЭЎНА-ЖАБКА

*Руская народная казка*

Былі ў цара тры сыны. Вырашыў ён іх ажаніць. Загадаў кожнаму выйсці ў поле і выпусціць па страле: куды тыя ўпадуць, там і лёс свой сыны знойдуць.

У старэйшага сына страла ўпала на баярскі двор, у сярэдняга – на купецкі двор, а ў малодшага – Івана-царэвіча – на балота, да жабкі. Іван-царэвіч ёй кажа:

– Аддай маю стралу, жабка.

А тая яму:

– Бяры мяне замуж!

Засумаваў Іван-царэвіч, але што рабіць.

Згулялі тры вяселлі.

Паклікаў цар сыноў і загадаў, каб іх жонкі сшылі за ноч па кашулі.

Прыходзіць Іван-царэвіч сумны дадому. Жабка пытаецца:

– Чаго замаркоціўся?





– Бацька загадаў табе за ноч сшыць кашулю.

– Не маркоцься, а кладзіся спаць. Пераначуем – болей пачуем.

Лёг Іван-царэвіч спаць, а жабка ператварылася ў мудрую Васілісу, пляснула ў далоні:

– Служкі-дружкі, сшыйце да ранку кашулю!

Прачнуўся ранкам Іван-царэвіч, а на стале кашуля ляжыць. Узяў яе і панёс цару.

Кашулі старэйшых сыноў цар адаслаў слугам, а пра кашулю Івана-царэвіча, золатам і срэбрам расшытую, сказаў:

– Гэтую кашулю толькі на свята і насіць.

Зноў паклікаў цар сыноў, загадаў іх жонкам спячы за ноч хлеб.

Прыходзіць Іван-царэвіч сумны дадому. Жабка яго пытае:

– Чаго затужыў?

– Бацька загадаў табе за ноч спячы хлеб.

– Не тужы, а кладзіся спаць. Пераначуем – болей пачуем.

Ператварылася жабка ў мудрую Васілісу, пляснула ў далоні:

– Служкі-дружкі, спячыце да ранку хлеб!

Прачнуўся ранкам Іван-царэвіч, а на стале хлеб ляжыць. Узрадаваўся і панёс яго цару. Той якраз адаслаў хлябы старэйшага і сярэдняга братоў слугам, а пра хлеб Івана-царэвіча сказаў:

– Вось гэта хлеб, такі толькі на свята і есці.

Загадаў цар сынам з'явіцца заўтра з жонкамі на баляванне.





Зноў вярнуўся сумны Іван-царэвіч дадому. Жабка крумкае:

– Чаго, Іван-царэвіч, зажурыўся?

– Бацька загадаў прыйсці з табой на баляванне.

– Не журыся, а ідзі на баляванне адзін. Як пачуеш стукат ды грукат, не пужайся, а скажы ўсім: «Гэта мая жабка-жоначка едзе ў скарбоначцы».

Пайшоў Іван-царэвіч адзін. Браты ўжо сталі з яго пасмейвацца, як раптам пачуўся стукат-грукат. Госці спужаліся, а Іван-царэвіч кажа:

– Гэта мая жабка-жоначка едзе ў скарбоначцы.

Падляцела да царскага ганка пазалочаная карэта, і адтуль выйшла Васіліса.

Як сталі балявацъ, Васіліса выпіла віна, а рэшткі сабе ў левы рукаў выліла. Пачаставалася лебедзем, а костачкі ў правы рукаў кінула. Жонкі старэйшых братоў гэта ўбачылі і паўтарылі.

Прыйшоў час танцаваць. Васіліса махнула левым рукавом – з'явілася возера, махнула правым – паплылі па ім лебедзі.



А старэйшыя жонкі толькі гасцей запырскалі ды косці параскідалі, адна ў вока цару трапіла. Ён раззлаваўся і абедзвюх выгнаў.

Іван-царэвіч тым часам збег дадому, знайшоў жабіну скурку і спаліў яе. Вярнулася мудрая Васіліса – а скуркі няма. Зажурылася яна і кажа:

– Што ж ты нарабіў! Яшчэ тры дні – і я б тваёй навечна была. А цяпер бывай. Шукай мяне ў трыдзясятым царстве, у Кашчэя Бессмяротнага.

Ператварылася ў зязюлю і паляцела, а Іван-царэвіч пайшоў яе шукаць.

У чыстым полі сустрэўся яму мядзведзь. Іван-царэвіч лук ускінуў, а мядзведзь кажа:

– Не бі мяне, я табе яшчэ спатрэблюся.

Пашкадаваў яго царэвіч. Бачыць – ляціць качар. Ускінуў лук, а качар кажа:

– Не бі мяне, я табе яшчэ спатрэблюся.

Пашкадаваў яго царэвіч і пайшоў далей. Бачыць – бяжыць заяц. Зноў ускінуў лук, а заяц кажа:

– Не бі мяне, я табе яшчэ спатрэблюся.

Пашкадаваў яго царэвіч і пайшоў далей. Падышоў да мора, бачыць – на пяску шчупак ляжыць:

– Пашкадуй мяне – кінь у сіняе мора!

Кінуў ён шчупака ў мора, а сам далей ідзе. Прыйшоў у лес, бачыць – хатка на курыных лапках.

Кажа Іван-царэвіч:

– Хатка, хатка, павярніся да лесу задам, а да мяне перадам!





Хатка па яго загадзе павярнулася да лесу задам, а да яго перадам. Зайшоў, а там на печы Баба-Яга – касцяная нага. Убачыла яна царэвіча і кажа:

– Навошта да мяне завітаў?

– Ах, Баба-Яга – касцяная нага, ты б мяне спачатку напаіла, накарміла, у лазні папарыла, а тады ўжо пыталася!

– І тое праўда! – адказвае Баба-Яга. Накарміла яна Івана-царэвіча, напаіла, у лазні папарыла, а царэвіч ёй расказаў, што шукае ён жонку сваю, Васілісу.

– Жонка твая цяпер у Кашчэя Бессмяротнага, – сказала Баба-Яга. – Цяжка з ім справіцца: яго смерць на канцы іголкі, іголка ў яйку, яйка ў качцы, качка ў зайцы, заяц сядзіць у куфры, а куфар вісіць на высокім дубе, і дуб той Кашчэй як зрэнку вока беражэ.

Іван-царэвіч у Бабы-Ягі пераначаваў, а ранкам яна яму паказала, дзе расце высокі дуб. Пайшоў туды Іван-царэвіч і бачыць – стаіць, шуміць дуб высокі, а на ім куфар вісіць, і дастаць той куфар цяжка.

Раптам прыбег мядзведзь і вывернуў дуб з карэннем. Куфар упаў і разбіўся. З куфра выскачыў заяц і штосілы пабег прэч. А за ім – іншы заяц, дагнаў і на кавалкі разарваў. Вылецела з зайца качка і ўзнялася ў самае неба. І тут на яе качар як напаў, як ударыў – качка яйка ўпусціла, упала яно ў сіняе мора. І вось падплывае да берага шчупак і падае́ яйка Івану-царэвічу. Іван-царэвіч яйка разбіў, дастаў адтуль іголку і зламаў яе. Так Кашчэй Бессмяротны і памёр.

Пайшоў Іван-царэвіч у Кашчэеў палац белакаменны. Выбегла да яго мудрая Васіліса. Іван-царэвіч вярнуўся з ёй дадому, і жылі яны доўга і шчасліва.

# МАРОЗКА

*Руская народная казка*



Жылі-былі дзед ды баба. У дзеда была дачка і ў бабы была дачка. Што бабіна родная дачка ні зробіць, за ўсё яе хваляць, а як падчарка – дык усё кепска. Вецер хоць пашуміць і заціхне, а злы чалавек разыдзецца – не хутка спыніцца.

Вырашыла мачыха падчарку выгнаць:

– Звязі яе, стары, каб вочы мае яе не бачылі, каб вушы мае пра яе не чулі, вязі не да сваякоў, а ў чыстае поле на мароз!

Стары замаркоціўся, але пасадзіў дачку на сані, хацеў прыкрыць коўдрай – але пабаяўся, павёз у поле, пасадзіў на сумёт, перахрысціў, а сам хутчэй дадому, каб не бачыць яе смерці.

Засталася бедная падчарка адна, трасецца і ціха моліцца. Прыходзіць Мароз, паскоквае, на дзяўчыну паглядае:

– Я Мароз – чырвоны нос!

– Вітаю цябе, Мароз! Відаць, Бог прынёс цябе па маю душу.

Мароз хацеў дзяўчыну замарозіць, але спадабаліся яе словы, пашкадаваў – кінуў футра. Апранулася падчарка, падціснула ножкі, сядзіць.

Зноў ідзе Мароз – чырвоны нос, паскоквае, на дзяўчыну паглядае. Зноў дзяўчына яго прывітала, а той падарыў ёй куфар, поўны ўсялякага дабра. Села падчарка ў футры на куфар, такая вясёленькая, такая прыгожанькая!



Зноў ідзе Мароз – чырвоны нос, паскоквае, на дзяўчыну паглядае. Зноў дзяўчына яго прывітала, а ён падарыў ёй сукенку, вышытую срэбрам і золатам. Надзела яе дзяўчына і зрабілася такой прыгожай!

А мачыха па ёй хаўтуры ладзіць, бліны пячэ.

– Вязі, муж, сваю дачку на пахаванне.

Стары паехаў, а сабачка пад сталом зацяўкаў:

– Дзедаву дачку ў золаце і срэбры вязуць!

Старая і бліны яму давала, і біла, а сабачка ўсё сваё паўтараў.

Адчынілася брама, нясуць куфар цяжкі, ідзе падчарка – чыстая паненка! Мачыха зірнула – і як закрычыць:



– Запрагай коней, стары, вязі хутчэй маю дачку на тое ж поле, на той жа сумёт!

Павёз стары дачку мачыхі на тое ж поле, на той жа сумёт. Прыйшоў і Мароз – чырвоны нос, паскакаў, а добрых слоў не дачакаўся і замарозіў яе.

– Хуткіх коней запрагай, стары, маю дачку вязі ды глядзі, каб куфар не паваліўся!

А сабачка пад сталом:

– Ад бабінай дачкі адны косткі ў торбачцы вязуць!

Не паверыла яму старая, але адчынілася брама, выбегла яна сустракаць дачку, але абняла толькі халоднае цела. Заплакала – ды позна!



# ПА ШЧУПАКОВЫМ КАЗАННІ

*Руская народная казка*

Жыў стары, і былі ў яго тры сыны: двое разумныя, а трэці дурань – Ямеля.

Тыя браты працуюць, а Ямеля цэлы дзень на печы ляжыць.

Аднойчы браты паехалі на кірмаш, а іх жонкі пачалі прасіць Ямелю:

– Схадзі па ваду.

– Няма ахвоты...

– Схадзі, а то браты з кірмашу пачастункаў не прывязуць. Злез Ямеля з печкі, узяў вёдры і сякеру і пайшоў на рэчку.

Прарубіў лёд, набраў вады і глядзіць у палонку. А там шчупак. Схітрыўся і схапіў рыбіну:

– Вось дык юшкі наварым!

Раптам шчупак яму кажа:

– Адпусці мяне, я табе паслужу.

– Чым ты мне паслужыш? Не, панясу цябе дадому, скажу братавым юшкі наварыць.

Шчупак зноў пачаў маліць-прасіць.





– Добра, – кажа Ямеля. – Толькі спачатку пакажы, што не падманваеш мяне.

– Скажы, а чаго ты цяпер хочаш?

– Каб вёдры самі пайшлі дадому.

– Як толькі табе чаго захочацца, скажы: «Па шчупаковым казанні і па маім жаданні» – і ўсё будзе.

Ямеля і кажа:

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – ідзіце, вёдры, самі дадому.

Толькі вымавіў, як вёдры пайшлі ўгару. Адпусціў Ямеля шчупака, а сам пайшоў за вёдрамі.

Ідуць вёдры праз вёску, людзі дзівяцца, а Ямеля ідзе ззаду, пасмейваецца. Зайшлі вёдры ў хату і самі сталі на лаўку, а Ямеля палез на печку.

Праз некаторы час братавыя кажуць яму:

– Насек бы ты, Ямеля, у лесе дроў.

– Няма ахвоты...

– Ну і не будзе табе пачастункаў.

Злез Ямеля з печы, узяў вяроўку і сякеру, выйшаў на двор і сеў у сані:

– Адчыняйце браму!

Братавыя пасмяяліся з дурня, што хоча без каня ехаць, але браму адчынілі. А Ямеля ціхенька і кажа:

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – едзьце, сані, у лес.

Паехалі сані, ды так хутка – на кані не дагнаць.

А ў лес ехаць трэба было праз горад, дзе Ямелевы сані шмат людзей падушылі.

Прыехаў ён у лес:



– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – насячы, сякера, самых сухіх дроў, а вы, дровы, падайце ў сані і звязвайцеся.

Пасля Ямеля загадаў сякеры высекчы дубінку – такую, каб ледзь падняць можна было. Сеў у сані:

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – едзьце, сані, дадому.

Зноў едзе Ямеля праз той горад, дзе нядаўна падушыў шмат люду, а там яго ўжо чакаюць. Схапілі, лаюць і б'юць.

Бачыць ён, што справы дрэнь, і ціхенька кажа:

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – дубінка, надавай ім пад бакі.

Дубінка выскачыла і пачала ўсіх навокал біць. Людзі кінуліся прэч, а Ямеля прыехаў дадому і залез на печ.

Пачуў неўзабаве цар пра Ямелевы выхадкі і паслаў па яго свайго найвялікшага вяльможу, каб прывёз дурня ў палац.

Накупіў вяльможа разынак, чарнасліву, пернікаў, прыехаў у Ямелеву хату і пачаў пытаць братавых, што Ямеля любіць.

– Калі яго ласкава папросяць і каптан чырвоны паабяцаюць – тады ўсё зробіць.

Даў вяльможа Ямелю разынак, чарнасліву, пернікаў і кажа:

– Чаго ты, Ямеля, на печы ляжыш? Паехалі да цара.

– Мне і тут цёпла.

– У цара цябе будуць добра карміць-паіць, паехалі, калі ласка.

– Няма ахвоты...



– Цар табе чырвоны каптан падорыць, шапку і боты.

– Ну, добра, ідзі наперад, а я – за табой.

Паехаў вяльможа, а Ямеля паляжаў яшчэ і кажа:

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – едзь, печ, да цара.

Тут хата затрашчала, дах захістаўся, сцяна развалілася, і печ сама пайшла да цара.

Глядзіць цар у акно, дзівіцца:

– Што за цуд?

– Гэта Ямеля на печцы едзе.

Выйшаў цар на ганак:

– Нешта, Ямеля, на цябе скаргаў шмат! Людзей санямі падушыў.

– А навошта яны пад сані лезлі?

А з акна на яго глядзела царская дачка – Мар'я-царэўна. Ямеля ўбачыў яе і ціхенька кажа:

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – хай царская дачка ў мяне закахаецца.

І загадаў печы ісці дадому. Тая павярнулася і пайшла. Зноў Ямеля дома ляжыць.

А ў царскім палацы крык і слёзы. Мар'я-царэўна жыць без Ямелі не можа, просіць бацьку, каб выдаў яе за Ямелю замуж. Зажурыўся цар і кажа вяльможу:

– Прывядзі да мяне Ямелю.

Накупіў вяльможа вінаў ды ласункаў, паехаў да Ямелі. Той напіўся-наеўся, захмялеў і заснуў. А вяльможа паклаў яго ў воз і павёз да цара, які загадаў пасадзіць Ямелю і Мар'ю ў вялікую бочку, засмаліць і ў мора кінуць.

Прачынаецца Ямеля, бачыць – цёмна, цесна:



– Дзе гэта я?

А яму ў адказ:

– Нас у бочку пасадзілі, засмалілі і кінулі ў мора.

– А ты хто?

– Я – Мар'я-царэўна.

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – выкаціце, вятры, бочку на бераг.

Выкацілі вятры бочку на бераг, выйшлі з яе Ямеля і Мар'я-царэўна.

– Дзе ж мы жыць будзем, Ямеля? Пабудуй якую хацінку.

– Па шчупаковым казанні і па маім жаданні – пабудуйся, каменны палац з залатым дахам.

Толькі сказаў – з'явіўся неверагодны палац. А вакол яго яшчэ і зялёны сад. Зайшлі Мар'я-царэўна і Ямеля ў палац, селі ля акенца.

Тым часам цар ехаў на паляванне і бачыць – стаіць палац, дзе раней нічога не было.

– Хто гэта без майго дазволу палац паставіў?

І паслаў запытаць, хто ў палацы жыве. Прыбеглі пасланцы, а Ямеля ім кажа:

– Клічце цара да мяне ў госці.

Цар прыехаў, а Ямеля яму кажа:

– Што ж ты мяне са сваёй дачкой у бочцы засмаліў, у мора кінуў? Захачу – усё тваё царства падпалю.

Цар спужаўся, пачаў прабачэння прасіць:

– Жаніся з маёй дачкой, Ямелька, бяры маё царства, толькі не губі!

Зладзілі тут вяселле на ўвесь свет, і Ямеля пачаў правіць царствам.



# ХАЎРОШАЧКА

*Руская народная казка*

У адной беднай удавы была дачка Хаўрошачка. Жылі яны шчасліва, ды прыйшла бяда: памерла ўдава. Сірату ўзяла да сябе цётка, у якой былі свае тры дачкі: Аднавочка, Двухвочка і Трохвочка.

Кепска жылося Хаўрошачцы. Адно было суцяшэнне – Кароўка, што засталася пасля смерці маці. Часам заваліць цётка дзяўчыну работай, а яна пойдзе да Кароўкі:

– Кароўка – мудрая галоўка! Наказала мне цётка напрасці, наткаць, набяліць палатна!

– Залезь мне ў адно вушка, вылезь у другое – усё будзе гатовае.

Вылезе Хаўрошачка з вушка, а палатно і праўда гатовае.

Дзівіцца цётка, што дзяўчына ўсё паспявае, і яшчэ больш ёй работы дае. Але Хаўрошачка ўсё адно з ёй спраўляецца.

Вырашыла цётка дазнацца, хто ёй дапамагае. Паклікала да сябе старэйшую дачку і загадала сачыць за сіратой.

Пайшла Аднавочка разам з Хаўрошачкай у поле. Селі на траўку, а Хаўрошачка прыгаворвае:

– Вочка, спі, вочка, засні!

Заснула Аднавочка, а Кароўка ўсе справы зрабіла.

Прыйшлі дзяўчаты дадому. Спытала маці Аднавочку, але нічога не даведалася. Раззлавалася і назаўтра паслала Двухвочку. Тая таксама разлеглася на траўцы, дрэмле, а Хаўрошачка прыгаворвае:

– Вочка, спі, другое, засні!



Кароўка работу зрабіла, а Двухвочка ўсё спіць.

І гэтым разам нічога не дазналася цётка. Раззлавалася і ў трэці дзень паслала Трохвочку.

Прыйшлі дзяўчаты ў поле. Пасядзела Трохвочка, лягла на траўку, а Хаўрошачка прыгаворвае:

– Вочка, спі, другое, засні!

А пра трэцяе забыла – яно ўсё ўбачыла. Прыйшла Трохвочка дадому, расказала ўсё маці. Тая загадала мужу зарэзаць Карову.

Пачаў ён нож тачыць, а Хаўрошачка кінулася да Кароўкі, абдымае яе, слязамі заліваецца:

– Кароўка – мудрая галоўка! Хочуць цябе зарэзаць.

– Не плач, а зрабі, як я скажу. Костачкі мае збяры і ў садзе закапай, кожны дзень іх крынічнай вадой палівай.

Зрабіла Хаўрошачка так, як ёй Кароўка сказала. Вырасла ў садзе яблыня, ды з сакаўнымі яблычкамі. Хто міма ні ідзе – любуецца.

Гулялі аднойчы дзяўчаты ў садзе, а міма ехаў малады прыгожы пан. Убачыў ён сакаўныя яблычкі і кажа:

– Вітаю вас, дзяўчаты! Прыгожыя ў вас яблычкі. Якая з вас мне адзін дасць, з той і ажанюся.

Кінуліся сёстры да яблыні, а галіны з пладамі высока – не дацягнуцца. Падышла Хаўрошачка – галіны самі нахіліліся, яблычкі ў рукі ўпалі.

Падала яна яблык пану, той пасадзіў сірату ў брычку і павёз ад злой цёткі. Выйшла Хаўрошачка за пана замуж, і пачалі яны жыць-пажываць і дабра нажываць.



# КУЛЬГАВЕНЬКАЯ КАЧКА

*Украінская народная казка*

Жылі ў адной вёсцы дзед і баба. Жылі адны, бо дзяцей не мелі.

Неяк пайшлі яны ў лес грыбы-ягады збіраць. Раптам бачыць бабка: пад кусцікам – гняздзечка, а ў гняздзечку – Качка.

Кажа бабка дзеду:

– Давай возьмем яе з сабой, хай у нас жыве.

Убачылі яны, што ў Качкі ножка зламаная. Узялі яе асцярожненька, прынеслі дадому, зладзілі ўтульнае гняздзечка, абклалі яго пёркамі і пасадзілі туды Качку, а самі зноў у грыбы пайшлі.

Неўзабаве вярнуліся і бачаць: у хаце нехта прыбраў, боршч зварыў, на стале ўсё для абеду расклаў.

Пачалі старыя распытваць суседзяў:



– Хто гэта ў нас пагаспадарыў?

Але ніхто нічога не бачыў.

Назаўтра зноў пайшлі дзед і бабка ў грыбы, а калі вярнуліся – зноў нехта ўсё прыбраў, пасцель памяняў, ручнікі чыстыя, на вокнах фіранкі новыя.





Зноў старыя суседзяў распытваюць.

– А ў вас дзяўчына прыгожая жыве, – адказалі ім, – ходзіць па ваду да крыніцы. Толькі кульгае трошкі на адну ножку.

Тады бабка кажа дзеду:

– А давай заўтра зноў пойдзем быццам у грыбы, а самі схаваемся і пабачым, хто ў нас гаспадарыць.

Назаўтра яны быццам сабраліся ў лес ісці, а самі за свірнам схаваліся. Раптам бачаць – выходзіць з хаты прыгожая дзяўчына і з каромыслам і вёдрамі ідзе да крыніцы. Толькі трошкі кульгае на адну ножку. Зайшлі старыя ў хату, а там гняздзечка пустое, толькі пер’е вакол яго раскіданае. Схапілі гняздзечка і выкінулі ў печку. Яно і згарэла.



А дзяўчына вярнулася ў хату, убачыла, што старыя зрабілі, і горка заплакала. Пачалі яе суцяшаць:

– Не плач, мілая, не плач, красуня! Зажывём разам, будзеш нам замест дачкі. Будзем цябе любіць і песціць.

А дзяўчына ім адказвае:

– Век бы я ў вас жыла, толькі навошта вы спалілі маё гняздзечка і за мной падглядалі? Цяпер я ў вас застацца не магу! Зрабі мне, дзядуля, калаўрот і верацяно, я ад вас сыду.



Як ні ўгаворвалі яе старыя, дзяўчына не згаджалася. Прыйшлося старому зрабіць ёй калаўрот і верацяно. Села дзяўчына на двары і пачала прасці.

Тут удалечыні паказалася чародка качак. Убачылі яны дзяўчыну, падляцелі бліжэй і заспявалі:

– Гэта ж нашая сваячка,
Нашая сястрыца-качка!
Мы ёй скінем па пяры,
Хай палётае ўгары!

А дзяўчына ім адказвае:

– Не хачу я з вамі ляцець.
Калі я зламала ножку,
Вы сабраліся ў дарожку,
Мне ж ніхто не дапамог:
Вы з усіх ляцелі ног!

Скінулі ёй качкі па пяры, а самі далей паляцелі. Вось ляціць другая чародка качак і таксама спявае:

– Гэта ж нашая сваячка,
Нашая сястрыца-качка!
Мы ёй скінем па пяры,
Хай палётае ўгары!

Дзяўчына і ім адмовіла. Тады яны скінулі ёй па пяры і таксама паляцелі.

Ляціць трэцяя чародка качак. Убачылі яны дзяўчыну, скінулі ёй па пяры, дзяўчына абляпілася імі, ператварылася ў кульгавенькую Качку і паляцела разам з чародкай.

А дзедка і бабка зноў засталіся адны.



# У СОНЕЙКА Ў ГАСЦЯХ

*Славацкая народная казка*

Аднойчы вялікая хмара схавала неба. Сонца тры дні не паказвалася. Засумавалі без яго Кураняты.

– Куды гэта Сонейка падзелася? Трэба яго хутчэй на неба вярнуць.

– Дзе ж вы яго знойдзеце? – заквахтала Курка-нясушка. – Хіба вы ведаеце, дзе яно жыве?

– Пакуль не ведаем, але як сустрэнем каго, дык спытаем, – адказалі Кураняты.

Сабрала іх Нясушка ў дарогу. Дала мяшэчак і торбачку. У мяшэчку – зярнятка, у торбачцы – макавінка.

Выправіліся Кураняты ў дарогу. Ішлі-ішлі – і бачаць: на агародзе сядзіць Слімак. Сам вялікі, рагаты, а на спіне – хатка.





Спыніліся Кураняты і пытаюць:

– Слімак-Слімак, дзе Сонейка жыве?

– Не ведаю. Вунь на жываплоце Сарока сядзіць, можа, яна ведае.

А Сарока і не чакала, пакуль Кураняты да яе падыдуць. Падляцела, засакатала, забалбатала:

– Кураняты, вы куды ідзяце, куды?

Тыя адказваюць:

– Ды вось Сонейка схавалася. Ідзём яго шукаць.

– І я пайду з вамі! І я пайду з вамі!

– А ты ведаеш, дзе яно жыве?

– Я сама не ведаю, а Заяц, можа, ведае, – засакатала Сарока.

Пайшлі яны да Зайца.

– Заяц-Заяц, – запішчалі Кураняты, засакатала Сарока, – можа, ты ведаеш, дзе Сонейка жыве?

– Я сам не ведаю, а вось мая суседка, Качка, напэўна, ведае. Дом яе ў чароце ля ручая.

Павёў Заяц усіх да ручая. А там Качыны дамок стаіць і човен побач прывязаны.



– Гэй, суседка, – крыкнуў Заяц, – мы Сонейка ідзём шукаць – не ведаеш, дзе яно жыве?

– Я сама не ведаю, а вось за ручаём, пад дуплістым букам, стаіць хатка Вожыка – ён ведае.

Перабраліся яны на чоўне праз ручай і пайшлі Вожыка шукаць. А той драмаў пад букам.

– Вожык-Вожык, – закрычалі Кураняты, Сарока, Заяц і Качка, – ты не ведаеш, дзе Сонейка жыве? Тры дні не было яго на небе, ці не захварэла.



– Канечне, ведаю! За букам – вялікая гара. На ёй – вялікае воблака. Над воблакам – срэбны месяц, а там і да Сонца ўжо блізка!

Прыйшлі яны на макаўку высокай гары, залезлі на воблака – і паляцела яно проста да Месяца. А той убачыў іх і адразу ж запаліў свой срэбны ражок.

– Месяц-Месяц, – закрычалі яму Кураняты, Сарока, Заяц, Качка і Вожык, – пакажы нам, дзе Сонейка жыве!

Прывёў іх Месяц проста да Сонцавага дома. Сарока засакатала, Кураняты запішчалі, Качка закракала, Заяц вушамі залопаў, а Вожык загрукаў:

– Сонейка, мілае, вызірні, выблісні!

– Хто пад акенцам крычыць? – спытала Сонейка. – Хто мне спаць перашкаджае?

– Гэта мы – Кураняты, Сарока, Заяц, Качка і Вожык. Прыйшлі цябе будзіць.

– Вох, вох!.. – застагнала Сонейка. – Як жа мне на неба вызірнуць? Тры дні мяне хмары хавалі, я цяпер і заблішчаць не змагу...

Пачуў пра гэта Заяц, схапіў вядро і пачаў ваду цягаць. А Качка пачала Сонца вадой мыць. А Сарока – ручніком выціраць. А Вожык – калючым шчаціннем начышчаць. А Кураняты – змахваць з Сонейка парушынкі.

Вызірнула на неба Сонца, яснае ды залатое. Выйшла пагрэцца на Сонейка Курка-нясушка. І Кураняты ўжо тут – па двары бегаюць, зярняты шукаюць, на Сонейку грэюцца. Хто не верыць, хай сам зірне: бегаюць па двары Кураняты ці не?



# Зязюля

*Ненецкая народная казка*



Жыла бедная жанчына. Было ў яе чацвёра непаслухмяных дзяцей. Гулялі яны цэлы дзень на дварэ, а як вернуцца ў чум, як нанясуць снегу – а маці прыбірай. Цяжка ёй было.

Неяк лавіла маці на рацэ рыбу. Дзеці ёй не дапамагалі, і яна захварэла. Ляжыць у чуме, дзяцей кліча:

– Дзеткі, дайце мне вады.

Не ідуць дзеці па ваду.

Адзін кажа:

– Я без пімаў.

Другі:

– Я без шапкі.

Трэці:

– Я без адзежы.

А чацвёрты ўвогуле не адказвае. Кажа тады маці:

– Рэчка побач, можна і без адзежы схадзіць. Прынясіце вады, піць хачу!

Засмяяліся дзеці і пабеглі з чума. Доўга гулялі, да маці не зазіралі. Нарэшце старэйшы прагаладаўся, заглянуў у чум – а там маці стаіць і маліцу апранае.



І раптам маліца пакрываецца пер'ем. Бярэ маці дошку, на якой шкуры скрабуць, – а дошка птушыным хвастом робіцца. Напарстак у дзюбу ператварыўся. Замест рук крылы выраслі. Ператварылася маці ў зязюлю і вылецела з чума.

Пабеглі дзеці за маці, крычаць ёй:

– Мама, мы табе вадзічкі прынеслі.

– Позна! Я лячу да вольнай азёрнай вады!

Бягуць дзеці за маці, карэц з вадой ёй працягваюць:

– Вось табе вада, мама! Папі вады, мама, вярніся дадому!

– Позна, дзеткі, не вярнуся я.

Беглі дзеці за маці шмат дзён і начэй – па камянях, па багнах, па імшарах. Ногі паранілі да крыві. Дзе прабягуць – там чырвоны след застаецца.





Назаўсёды кінула дзяцей маці-зязюля. З таго часу не ўе яна гнёздаў, не гадуе сваіх дзяцей.

А ў тундры з таго часу чырвоны мох сцелецца.

Змест

Прадмова ........ 1
Крылаты, Калматы ды Маслены. *Руская народная казка* .... 2
Хто баіцца, таму ўваччу дваіцца. *Руская народная казка* .... 8
Сіўка-бурка. *Руская народная казка* ........ 10
Царэўна-жабка. *Руская народная казка* ........ 20
Марозка. *Руская народная казка* ........ 30
Па шчупаковым казанні. *Руская народная казка* ........ 34
Хаўрошачка. *Руская народная казка* ........ 44
Кульгавенькая Качка. *Украінская народная казка* ........ 48
У Сонейка ў гасцях. *Славацкая народная казка* ........ 54
Зязюля. *Ненецкая народная казка* ........ 60

ЕАС

*Серыя заснавана ў 2016 годзе*

**Рэцэнзент**
старшыня Рэсп. тэрмінал. камісіі пры НАН Беларусі, д-р філал. навук,
праф., чл.-кар. НАН Беларусі ***А. М. Булыка***

*Выданне развіваючага навучання*

ВУЧЫМСЯ РАЗАМ

# ЧЫТАНКА-МАЛЯВАНКА

**Для дзяцей ад пяці гадоў**

## Казкі народаў свету

Для сумеснай работы дарослага і дзіцяці дашкольнага ўзросту

Пераклад *Г. В. Янкуты*
Мастак *Таццяна Шайпак*
Адказны за выпуск *Д. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк 03.11.2016. Фармат 84×108 1/16. Папера афсетная. Гарнітура «Rotonda».
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,72. Ул.-выд. арк. 6,96. Тыраж 2100 экз. Заказ 2648.
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/15 ад 02.08.2013.
Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
**E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by**
Кантактныя тэлефоны: (017) 268-09-79, 268-08-78.
Для пісьмаў: а/с 3, 220090, Мінск.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва “Беларускі Дом друку”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Прасп. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

УДК 373.2.016:003-028.31
ББК 74.102
Ч-97

**ISBN 978-985-533-413-3**

© Афармленне. ТДА «Аверсэў», 2016

Вазьмі ў рукі алоўкі ці фарбы яркіх колераў і выпраўляйся ў вясёлае падарожжа з героямі ўлюбёных твораў. Чытай разам з дарослымі, размалёўвай, выдумляй. Стварай сваю казку сам!

## У гэтай серыі:
















ISBN 978-985-533-413-3
9 789855 334133